# Юрась Бушлякоў

# Лазьня

Некалі, у найстаражытнейшым часе, кроплі дажджу праз лядачую страху патрапілі на гарачае каменьне дамовага агменю, і клубы пары ахуталі людзей прыемнаю цеплінёю. З тае прыгоды, як даносіць нам легенда, і бярэ свае пачаткі *лазьня*. Лячыцца параю — *лазілі*, долу ці ўгору — адсюль *лазьня*. Хворым замест лекаў *лазьню* прапісваў часьцяком яшчэ грэцкі доктар Гіпакрат. Нашыя продкі лічылі, што ў аблоках пары ў *лазьні* крыецца добры дух. І гучэла, і гучыць сёньня *лазьневае* павітаньне беларусаў — *лёгкі дух*. Лёгкі — значыць прыемны, той, які нясе радасьць і палёгку. *Лазьню* ў нас ставілі з тонкага бярвеньня, жэрдкавую столь — каб трымалася цяплосьць — засыпалі кастрыцаю ці пяском. Здавён парыліся па-чорнаму — дым зь печкі-каменкі йшоў проста ў парыльню. І дасюль у нас захаваліся курныя *лазьні* — на Шумілёншчыне, напрыклад. Ёсьць нат заўзятыя парцы, якія лічаць дымавую пару неадменнай і не баяцца ўчадзець. Бяздымная *лазьня* для такіх — ня *лазьня*. Але ня гэткі быў герой Гарэцкага Клім Шамоўскі — залез ён на палок і заплакаў ад дыму, а тады, махаючы венікам, праклінаў і *лазьню*, і тых глуздоў, якія пабудавалі яе такую. Балазе, у XX стагодзьдзі ставілі ўжо *лазьні* пераважна з комінам. Як напісаў быў некалі Караткевіч, парацца беларусы да зьнемажэньня. Найперш клапоцяцца пра „смачную пару“ — гатуюць яе бярозавікам, квасам або вадою, у якой распараная мята ці якая іншая духмяная трава. Парацца зь венікам — найчасьцей бярозавым ці дубовым, радзей з крапіўным або хваёвым: сьпярша гладзяць, тады паляпваюць, а пасьля ўжо хвастаюць, забіраючы венікам пару. Ад таго хвастаньня й выразы *лазьні даць* або *лазьню дастаць* — значыцца, разабрацца з кімсьці або самому ў карак атрымаць.

У нашыя дні той, хто не махнуў на сябе рукою й ня страціў цікавасьці да жыцьця, учашчае ў *лазьню* — у агульную грамадзкую або ў сваю, на вясковым падворку ці на летнікавай дзялянцы. Усё часьцей называюць *лазьню* *саўнай* — фінскім словам, якое азначае гарачую вельмі, з сухім паветрам, *лазьню*. *Лазьня* зьбірае людзей розных, бо, як кажуць, парыцца можа ўсякі, хто здольны дайсьці да *лазьні*.